ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.22 (3048) ● ● ЧАЦВЕР, 14 чэрвеня, 2007

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**



**Водная повязь краін**

Беларусь і Літва падпісалі міжурадавую дамову аб суднаходстве па ўнутраных водных шляхах. **Стар. 2**



**Знічкі Айчыны** **Стар. 3**



**Праехаць па глыбінцы**

Упершыню праводзіцца Міжнародны веласіпедны тур па Беларусі. **Стар. 4**

# Вакол сядзібы Дабжынскіх – добрая энергетыка

У вёсцы Лоша, што ў Астравецкім раёне на Гродзеншчыне, прайшоў першы пленэр, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння мастака Льва Дабжынскага.

**Адам Мальдзіс**

Вёска Лоша расцягнулася ўздоўж ракі… Якой? Вы правільна падумалі: уздоўж ракі Лоша. Этымалагічна свой радавод і рака, і вёска нібыта вядуць ад балцкага слова “лоша” — пстронга, фарэль. На маёй памяці гэтая прыгожая і смачная рыбіна (дарэчы, яна цяпер красуецца на гербе Астраўца) пасля апошняй вайны яшчэ вадзілася.

На паўднёвым канцы вёскі Лоша, у напрамку да Рымуняў, яшчэ за маёй памяці дзейнічаў млын, куды прыязджалі малоць збожжа сяляне, а ў іх ліку і мае бацькі, з блізкага і далёкага наваколля. Часам бралі з сабой і мяне, у чаканні сваёй чаргі паказвалі на вельмі старыя дрэвы, якія глядзеліся вяршалінамі ў зеленаватае люстэрка става пры млыне (ужо тады вады не хапала) і казалі:

— Туды хадзіць не трэба. Там раней была сядзіба паноў Дабжынскіх. Пасля таго, як апошні з іх роду застрэліўся ці яго застрэлілі, там пачала страшыць нячыстая сіла.

З таго часу пачаў я цікавіцца, хто ж гэта паў ахвярай “нячыстай сілы” ў Лошы. І аказалася, што гэта быў мастак, выпускнік Віленскага ўніверсітэта, вучань славутага Фердынанда Рушчыца Леў Дабжынскі, які атрымаў імя ў гонар свайго блізкага родзіча па матчынай лініі класіка рускай літаратуры Льва Талстога. **➔ Стар. 4**



КАЦЯРЫНА ШАПАШНІКАВА

**Мастака Льва Дабжынскага натхнілі на творчасць родныя краявіды**

# Колькасць беларусаў расце

**Ірына Цімафеева**

**У Беларусі сёлета нарадзілася больш за трыццаць дзве тысячы дзяцей.**

Па словах намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны Шаметавец, большая колькасць нованароджаных адзначаецца ў Гомельскай вобласці — 111,6 працэнта. У Брэсцкай вобласці гэты паказчык склаў 108,9 працэнта, у Магілёўскай — 108,3 працэнта. Найменшы рост колькасці нараджэнняў быў у Віцебскай і Мінскай абласцях (адпаведна 105,1 і 104,8 працэнта).

Па тэмпах росту нараджальнасці гарады апярэджваюць вёску. Так, колькасць нованароджаных у гарадах рэспублікі склала 108,8 працэнта, а ў сельскай мясцовасці — 104,5 працэнта. Прычым, найбольшы рост нараджальнасці адзначаецца ў гарадскіх паселішчах Гомельскай, Магілёўскай і Брэсцкай абласцей.

— У рэспубліцы складваецца дэмаграфічная сітуацыя, якая патэнцыяльна спрыяе павышэнню нараджальнасці, — гаворыць Таццяна Шаметавец. — Прымаюцца меры для таго, каб не страціць гэты патэнцыял.

Вядома, у сярэднім 70 працэнтаў нараджэнняў дзяцей прыходзіцца на жанчын ва ўзросце 20-24 гады і 25-29 гадоў. І колькасць жанчын, якія ўваходзяць у гэтыя ўзроставыя групы, будзе павялічвацца да 2010 года, а затым пойдзе на спад. Такім чынам, 2008-2013 гады будуць самымі спрыяльнымі для рэспублікі з пункту гледжання патэнцыяльных магчымасцяў для прыпынення скарачэння нараджальнасці.

Увогуле колькасць насельніцтва Беларусі цяпер складае 9 мільёнаў 702 тысячы чалавек. Нацыянальнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі прадугледжана, што да 2011 года колькасць беларусаў значна павялічыцца, і агульны каэфіцыент нараджальнасці складзе 10-11 на 1000 жыхароў.

**ВЕСТКІ**

## Прадпрымальнікі заявілі аб сабе ў рэгіёнах

**Уладзімір Даманаў**

**Праз тры гады бізнес будзе больш актыўна прадстаўлены ў малых гарадах.**

Па словах міністра эканомікі Беларусі Мікалая Зайчанкі, цяпер большая частка малога і сярэдняга бізнесу знаходзіцца ў вялікіх гарадах і ў сталіцы рэспублікі. “Але ў рэгіёнах добрая канкурэнтаздольная вытворчасць. Там ёсць і вялікі кадравы патэнцыял”, — лічыць Мікалай Зайчанка.

Міністр эканомікі назваў таксама іншыя фактары, якія будуць стымуляваць развіццё вытворчасці. Так, для прадпрыемстваў з колькасцю работнікаў да 15 чалавек, а такіх шмат у малых гарадах, уведзена адзіная форма падатку. Адзіны падатак для іх у два разы ніжэйшы, чым для іншых суб’ектаў гаспадарання. Для такіх прадпрыемстваў уводзіцца таксама спрошчаная сістэма бухгалтарскага ўліку.

## Ёсць перспектыўныя праекты

**Беларусь і Іран маюць намер пашыраць узаемавыгаднае супрацоўніцтва ў аграрнай сферы**

Перспектывы ўзаемнага супрацоўніцтва паміж міністэрствамі сельскай гаспадаркі Беларусі і Ісламскай Рэспублікі Іран абмеркаваны ў Мінску. Бакі абмяняліся інфармацыяй аб развіцці аграрнага сектара дзвюх краін, вызначылі сферы, дзе яны маглі б актыўна супрацоўнічаць.

У прыватнасці, у іранскіх спецыялістаў выклікалі цікавасць новыя сарты сельскагаспадарчых культур, створаныя беларускімі селекцыянерамі. Прадстаўнікі іранскай дэлегацыі пабывалі ў інстытутах пладаводства і агародніцтва, а таксама ў Інстытуце бульбаводства, дзе пазнаёміліся з тэхналогіямі вырошчвання культур.

У ходзе сустрэчы іранскі бок пацвердзіў зацікаўленасць у падрыхтоўцы ў Беларусі спецыялістаў для аграрнай галіны. У Іране асабліва вялікая патрэба ў спецыялістах ветэрынарнай медыцыны і экалогіі. Бакі дамовіліся аб абмене дэлегацыямі для вывучэння перадавога вопыту.

# Настойлівы шлях вядзе да адзінай мытнай прасторы

Фарміраванне Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана будзе завершана да 2010 года.

Ганна Бандарчук

Аб гэтым на Міжпарламенцкай асамблеі ЕўрАзЭС заявіў намеснік генеральнага сакратара Садружнасці Яўген Ворсін. Рашэнне аб фарміраванні пакета дакументаў па Мытнаму саюзу Расіі, Беларусі і Казахстана было прынята ў жнiўні мінулага года. Ён павінен уключаць у сябе 23 дакументы. З іх 18 на сённяшні дзень ужо ўзгоднены і знаходзяцца ва ўрадах трох дзяржаў. Гэтыя дакументы рэгулююць мытна-тарыфную палітыку, знешнеэканамічную дзейнасць, стварэнне адзінай мытнай прасторы. Пяць астатніх праектаў дакументаў будуць датычыцца натуральных манаполій, вызначаць канкурэнтнае асяроддзе, правілы субсідзіравання. Гэта, на думку Яўгена Ворсіна, вельмі важныя і складаныя пытанні, на вырашэнне якіх кожны з бакоў мае ўласны погляд.

Яўген Ворсін адзначыў, што іншай сур'ёзнай перашкодай на шляху фарміравання Мытнага саюза з'яўляецца ўступленне Расіі, Казахстана і Беларусі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Расія плануе далучыцца да яе ў 2007-2008 годзе, Казахстан — у 2008 годзе. Беларусь зараз вядзе перагаворы аб умовах уступлення. "Важна, каб у сувязі з гэтым дасягнутыя на сённяшні дзень дамоўленасці па фарміраванню Мытнага саюза прынцыпова не змяніліся", — падкрэсліў намеснік генеральнага сакратара ЕўрАзЭС.

Ён таксама паведаміў, што распрацаваны план дзеянняў па адаптацыі дакументаў, неабходных для стварэння Мытнага саюза, з нацыянальнымі заканадаўствамі краін-удзельніц. Гэты план разлічаны на 2007-2010 гады. Пасля яго рэалізацыі фарміраванне саюза будзе завершана, падкрэсліў Яўген Ворсін.

Пытанне фарміравання Мытнага саюза Расіі, Казахстана і Беларусі будзе абмяркоўвацца на пасяджэнні Міждзяржаўнага савета краін-членаў ЕўрАзЭС на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. Пасяджэнне плануецца правесці ў ліпені гэтага года ў Маскве.



Капітан судна "Лань-1" Андрэй Быкоўскі гатовы да падарожжаў паміж Беларуссю і Літвой

# Водная повязь краін

Беларусь і Літва падпісалі міжурадавую дамову аб суднаходстве па ўнутраных водных шляхах.

Юрый Акімаў

Падпісанне дакумента адбылося ў памежным пункце пропуску Каменны Лог- Мядзінінкай на беларуска-літоўскай сустрэчы, дзе абмяркоўваліся пытанні развіцця двухбаковага добрасуседскага ўзаемадзеяння, у тым ліку ў сферы транспарту і функцыянавання дзяржаўнай мяжы.

Падчас сустрэчы былі абмеркаваны меры далейшага развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, узмацненню ўзаемадзеяння ў энергетыцы, экалогіі, выкарыстанні водных артэрый, што злучаюць дзяржавы, у сферы турызму.

Адзначым, што водныя сувязі паміж Беларуссю і Літвой існавалі да 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Суднаходства злучала гарады Гродна і Друскінінкай. А ў сувязі з ўсталяваннем дзяржаўнай мяжы, частка якой пралягае па рацэ Нёман, водныя зносіны былі спынены. Рэалізацыя падпісанай дамовы дазволіць зноў наладзіць пасажырскае і грузавое суднаходства паміж Беларуссю і Літвой.

# Тэхніка абыходзіць іншых канкурэнтаў

Вольга Кісялёва

**У Краснадарскім краі Расіі адкрыты гандлёвы дом вытворчага аб'яднання "Гомсельмаш".**

Адкрыццё гандлёвага дома было прымеркавана да праведзенай на Кубані Міжнароднай выставы сельскагаспадарчай тэхнікі "Залатая Ніва 2007". У ёй прынялі ўдзел больш за 350 вытворцаў з Беларусі, Украіны, Расіі, Канады, ЗША, Германіі, Галандыі, Францыі, Італіі, Польшчы і іншых краін.

Беларуская экспазіцыя была прадстаўлена адзіным выставачным стэндам. "Гомсельмаш", які заваяваў галоўны прыз форуму, прадэманстраваў увесь мадэльны рад выпускаемай тэхнікі. У выставе ўдзельнічалі таксама Мінскі трактарны завод, "Бабруйскаграмаш", "Лідаграпраммаш".

Вялікі поспех беларуская сельгастэхніка мела падчас правядзення Дзён Поля, калі арганізатары выставы параўноўвалі тэхніку розных вытворцаў. Па выніках паказу кубанскія сельгасвытворцы адзначалі, што беларускія машыны не ўступаюць па сваіх тэхнічных і якасных характарыстыках замежным, але пры гэтым у паўтара-два разы таннейшыя.

Нездарма падчас выставы былі заключаны кантракты на набыццё трактароў "Беларус" розных мадыфікацый, іншай тэхнікі.

## ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

**На старонках "Голасу Радзімы" мы распачынаем новую рубрыку. У кожным нумары будзем пісаць аб тым, як жывуць сёння беларускія суполкі за мяжой, якія падзеі там адбываюцца. А пачынаем з навін пра Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага.**

# Уменне дбаць пра свае вытокі

Кацярына Немагай

**Больш за 100 гадоў прайшло з тых часоў, калі беларускія сяляне пачалі асвойваць сібірскія землі. Пераязджалі туды нават вёскамі, якія, дарэчы, існуюць і сёння.**

Па выніках экспедыцый, што ладзіць кожны год Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага, толькі ў Тулынскім раёне Іркуцкай вобласці былі выяўлены 124 такія вёскі, заснаваныя ў пачатку мінулага стагоддзя. І ў кожнай цяперашнія іх жыхары добра памятаюць аб сваім паходжанні. Тут і песні спяваюць беларускія, і старадаўнія нацыянальныя святы адзначаюць, і ўвогуле гаворка засталася беларуская.

— У нашай арганізацыі — каля 50 тысяч беларусаў, — расказваў мне па тэлефоне старшыня Іркуцкага таварыства беларускай культуры Алег Рудакоў. — Нават нашчадкі першых перасяленцаў (а гэта ўжо чацвёртае пакаленне) ведаюць родную мову. Паміж сабой мы гаворым толькі па-беларуску.

Прыемна было пачуць, што па ўсёй вобласці — у прыватнасці, у вёсках Тургенеўка і Тарнопаль, горадзе Брацку — дзейнічаюць аддзяленні таварыства. Ініцыятыўныя групы створаны ў вёсцы Чарчэт і горадзе Марыінску, а ў Тулынскім, Тайшэцкім, Заларэцкім раёнах адкрыліся філіялы таварыства. Захоўваць атмасферу беларускасці ў асяроддзі нашчадкаў былых перасяленцаў дапамагаюць у вобласці Гісторыка-этнаграфічны музей, музей-майстэрня "Беларуская хатка", бібліятэка. Увогуле, пастаянная праца вядзецца па вывучэнню жыцця беларускай дыяспары ў Сібіры: збіраюцца матэрыялы, праводзяцца этнаграфічныя экспедыцыі і навуковыя канферэнцыі.

— Штогод у канцы мая ў Іркуцку праходзіць Тыдзень беларускай культуры, — гаворыць Алег Васільевіч. — Сёлета мы асобна спыніліся на тэме народных рамёстваў — арганізавалі выставу "Беларускае рамяство жыве ў Прыбайкаллі". Прадставілі работы майстроў з усіх рэгіёнаў. Былі на ёй і выцінанкі, і абярэгі, і вырабы з бяросты, і сэнсавая вышыўка. Умельцы праводзілі майстар-класы. А жадаючых навучыцца было шмат.

Алег Рудакоў узнёсла і разам з тым неяк будзёна гаварыў аб тым, што ўсё гэта не дзіўна — хлопцы і дзяўчаты ў таварыстве пастаянна цікавяцца, як жылі іх продкі, чым займаліся, з задавальненнем пераймаюць навыкі быцця, якімі валодаюць іх бабулі і матулі. Дарэчы, маладзёжны клуб "Крывічы", што створаны пры таварыстве, адзначае літаральна ўсе нацыянальныя святы — Купалле, Каляды, Дзяды — па старадаўніх абрадах і запрашае на іх дарослых. Часта ладзяць нацыянальныя дыскатэкі, дзе гучаць родныя песні, многія выконваюцца пад баян. Вось і на Тыдні беларускай культуры мелі месца Беларускія вячоркі.

— На вечары адпачынку праводзіліся конкурсы, гульні. Дзяўчаты танчылі народныя танцы — Лявоніху, польку беларускую. Лепшай танцоўшчыцай абралі сёлета Марыю Пятрушка, якая родам з горада Баранавічы, — абавязкова прасіў адзначыць Алег Васільевіч. — Шмат конкурсаў сёлета ладзілі для дзяцей. Выбіралі лепшыя малюнкі, на якіх малыя адлюстроўвалі свае ўяўленні аб Беларусі, і сачыненні на тэму "Мой радавод". Для дзяцей і дарослых упершыню прайшоў семінар "Беларуская традыцыя". На ім праводзіліся заняткі аб беларускай мове, гісторыі краіны. Сур'ёзныя выступленні на гістарычную тэму, пра лёсы асобных беларусаў у Прыбайкаллі мы пачулі на навуковай канферэнцыі "Беларуская дыяспара Прыбайкалля: гісторыя, традыцыя, сучаснасць". Асобна расказвалі пра жыццё перасяленца, стваральніка карты Байкальскага рэгіёну Яна Чэрскага, у гонар якога і называецца наша таварыства.

Як надалося пасля размовы, цікава і насычана жывуць беларусы ў далёкім Іркуцку: захоўваюць культуру, цікавяцца гісторыяй, ствараюць сваю.

# Атрымалі прызнанне

Ірына Цімохіна

Дзве ўзнагароды заваявалі беларускія кінематографісты на XVI Міжнародным кінафестывалі "Залаты віцязь", які праходзіў у гарадах Стаўрапольскага краю.

Кінастужка Любові Бітно "Калядны падарунак" падзяліла перамогу ў намінацыі "Кароткаметражныя дакументальныя фільмы" з расійскай карцінай "Вясковы фатограф" Аляксея Пагрэбнага. Акрамя таго, "Бронзавы віцязь" быў прысуджаны ў конкурсе анімацыйных фільмаў беларускаму мультыплікатару Ірыне Кадзюковай за экранізацыю казак Андэрсена "Залатыя падковы". Усяго ў конкурсную праграму "Залатога віцязя" ўваходзіла больш за 200 фільмаў. Галоўную ўзнагароду (Гран-пры кінафоруму) атрымаў фільм расійскага рэжысёра Паўла Лунгіна "Востраў".

Голас Радзімы Чацвер, 14 чэрвеня, 2007




Вілейка. Георгіеўская плошча. Пачатак XX стагоддзя

# Знічкі Айчыны



Вілейка. Марыінская царква. Пачатак XX стагоддзя

**Вілейка — з тых гарадоў, што старажытнасць сваю, быццам самую дарагую каштоўнасць, уводзяць у сучасны свет, аберагаюць і нашчадкам прадстаўляюць як самае галоўнае багацце. І плён ад гэтага ёсць немалы. Мяркую па сваіх уражаннях ад сустрэч з вілейчукамі розных пакаленняў. Ёсць у мяне сябар Толя Наркевіч. Чалавек, для якога гісторыя і блізка не можа стаць прафесіяй. А вось пагаворыш з ім, закранеш вілейскую тэму — дасведчанасць гістарычнага кшталту так і выліваецца з яго, бы з крыніцы бясконцай. А з маладзейшых віляйчан часта сустракаюся з будучым журналістам Сяргеем Макарэвічам. І ад яго і тэмы новыя адкрываю, і веданняў новых пра старажытны горад, старажытны край назбіраю… А што ўжо казаць пра сустрэчы ў самой Вілейцы!..Уся яе гістарычная прастора невыпадковая, яна складваецца з той, здавалася б, простай работы, якую ладзяць у Вілейцы і раёне дасведчаныя краязнаўцы, музейшчыкі, чулыя да даўніны асветнікі.**

**Алесь Карлюкевіч**

Выпадкова сустрэў у Мінску на турыстычнай выставе вілейскіх музейшчыкаў Валянціну Лапко і Вольгу Коласаву. Цікавіўся навінамі. Расказалі, што рыхтаваліся да экспедыцыі “Вілія і яе берагі. Па шляхах графа К. Тышкевіча праз 150 год”. Амаль цэлы месяц будзе яна доўжыцца — з 5 чэрвеня да 2 ліпеня. А пачалася ў вёсцы Каменка адкрыццём помніка у гонар 150-годдзя Канстанціна Тышкевіча.



Вілейка. Вакзал. Пачатак XX стагоддзя

А я ў чарговы раз задумаўся, колькі ж славутых суайчыннікаў звязана з Вілейшчынай. Колькі іх знічкамі адляцела ў вечнасць!.. Нават гетман украінскі Піліп Орлік паходжаннем з вілейскай вёскі Касута. Там усталяваны яму помнік.

А ў фальварку Мар’янполле, які цяпер не існуе, Касцяневіцкай парафіі Вілейскага павета нарадзіўся паэт-дэмакрат Эдвард Жалігоўскі. Першыя свае вершы “Туга”, “З літоўскіх мелодый” ён падпісваў псеўданімам Антон Сава. У 1846 годзе Жалігоўскі надрукаваў антыпрыгонніцкую вершаваную драму “Іардан”. Улады ўжо пасля выдання забаранілі твор. У Пецярбургу польскі паэт-дэмакрат пазнаёміўся з Тарасам Шаўчэнкам. На адным з вечароў наш зямляк прачытаў верш “Да брата Тараса Шаўчэнкі”. А ў вялікага Кабзара неўзабаве з’явіўся верш “Наследаванне Эдварду Саве”. Жалігоўскі з’яўляецца і перакладчыкам твораў Шаўчэнкі на польскую мову. Памёр наш зямляк у Жэневе ва ўзросце 48 гадоў. Там і пахаваны. А ў Вілейцы ёсць вуліца Жалігоўскага. Калі мы ўжо павялі размову пра літаратараў — ураджэнцаў Вілейшчыны, то варта ўзгадаць імя пісьменніка Касьяна Вясёлага. З біяграфіі яго няшмат звестак дайшло да нашага часу. Вось што, у прыватнасці, піша пра літаратара кандыдат філалагічных навук Янка Саламевіч: “Сапраўднае прозвішча і імя Аўдзей Вікенцій Іосіфавіч… Нарадзіўся ў 1886 г. ў вёсцы Губы Вілейскага раёна. Закончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1905), Віленскі настаўніцкі інстыттут (1910). Працаваў у гарадскіх вучылішчах Вільні і Вілейкі. Удзельнік Першай сусветнай вайны, загінуў у канцы 1916 г. на руска-аўстрыйскім фронце ў Карпатах…” Касьян Вясёлы — аўтар апавяданняў, вершаў, допісаў, змешчаных у часопісе “Крестьянин”.




Вілейка. Уездны з’езд. Пачатак XX стагоддзя

Напісаў сацыяльна-бытавую драму “Не розумам сцяміў, а сэрцам”, якую часта ставілі самадзейныя тэатры Заходняй Беларусі і пасля смерці пісьменніка.

Хаця і нарадзіўся на Лагойшчыне, самым цесным чынам з Вілейшчынай звязаны і Змітрок Бядуля. У Даўгінаве жыла цётка будучага пісьменніка, і таму Самуіла адправілі на вучобу ў ешыбот, які працаваў ў мястэчку. Частка тае навучальнай установы захавалася і да сённяшніх дзён, служыць мясцовым жыхарам як гаспадарчая пабудова. Праз тры гады, у 1902 г., Плаўнік развітаўся з кар’ерай рабіна. У вольныя хвіліны юнак заносіў у запісную кніжачку складзеныя ім вершы-гімны, прысвечаныя неіснуючай дзяўчынцы Мірыян. Гэтага хапіла для абвінавачвання яго ў здрадзе яўрэйству і выключэння з ешыбота”. І працоўная біяграфія Змітрака Бядулі звязана на самым пачатку з Вілейшчынай: некаторы час ён будзе працаваць настаўнікам у мястэчку Батурына. Цяпер — гэта невялікая вёсачка ў восем двароў, на тэрыторыі Хаценчыцкага сельсавета.



Вілейка. Жаночая прагімназія. Пачатак XX стагоддзя

У Вілейскай рускай гімназіі, пачынаючы з трэцяга класа, вучыўся паэт Максім Танк. У вёсцы Варонічы правяла сваё дзяцінства паэтэса Ганна Новік. Вось чый лёс прыняў на сябе ўсе калізіі суровага пераломнага часу. Мяркуйце самі. Нарадзілася ў 1914 годзе ў Аўгуставе былой Сувалкаўскай губерні (сучасная Польшча). У 1932 годзе закончыла сем класаў Куранецкай школы. Працавала батрачкай. Удзельнічала ў нацыянальна-вызваленчым руху. Неаднаразова арыштоўвалася. Два гады, з 1936 па 1938-ы, правяла ў зняволенні ў вілейскім астрозе. Як вызвалілі Заходнюю Беларусь, была абрана дэпутатам Народнага Сходу Заходняй Беларусі. У Вялікую Айчынную — партызанская сувязная. Пасля вайны спрабавала набыць адукацыю ў Мар’інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. Працавала старшынёй калгаса ў вёсцы Варонічы. Моцна хварэла. Займалася літаратурнай творчасцю. У 1961 годзе выдала вершаваны зборнік “Мае вёсны”. “Полымя” друкавала фрагменты яе аўтабіяграфічнай аповесці “Другая сустрэча”. Лісталася з Максімам Танкам. Памерла Ганна Новік ў 1997 годзе. Ужо пасля яе смерці вілейскія бібліятэкары выдалі невялікую кнігу яе творчай спадчыны.

Жыве і працуе на Вілейшчыне паэт Мікола Кутас. Калегі па працы дапамаглі яму — зараз творца загадвае бібліятэкай у вёсцы Суднікі — выдаць кніжачку вершаў “Пераязвоны”. Ёсць там такія радкі: Там, дзе Вілія змейкаю/ Атачыла бары,/ Месца клічуць Вілейкаю/ З дзён мінулых, старых”.

…З размовы з музейшчыкамі ведаю, што экспедыцыя “Вілія і яе берагі” праходзіць быццам у святле той гісторыка-краязнаўчай памяці, што кнігай “Вілія і яе берагі” пакінуў нашчадкам граф Тышкевіч. Ёсць там і такія словы: “З Вілейкі адплывалі 10 чэрвеня ў 6 гадзін раніцы. Пан Янушэвіч зрабіў малюнак — від горада з боку ракі: убогія халупы, агароды. Вёска, горадам названая…” А сёння Вілейка — сапраўдны горад. Сучасны раённы цэнтр. Са шматпавярховымі дамамі. З сур’ёзнымі прамысловымі прадпрыемствамі. І галоўнае — з людзьмі, якія ведаюць і шануюць сваю гісторыю ў самых розных яе праявах.

© В поисках утраченного. Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава

# Вакол сядзібы Дабжынскіх – добрая энергетыка

**(Працяг. Пачатак на стар. 1)**

Пахаваны Леў Дабжынскі быў пасля трохдзённага вагання польскай паліцыі: самазабойства гэта было ці ўсё ж забойства? Бо прыслуга бачыла, як пан Расальскі з суседніх Рымуняў паспешліва пакідаў спальню Льва, які толькі што, пасля паспяховай выставы ў Вільні, атрымаў адзіную (на ўсю даваенную Польшчу!) стажыроўку ў Францыі. Але да Парыжа трэба было даехаць за свае грошы, і малады мастак папрасіў іх у маці, опернай спявачкі, якая пасля смерці мужа, дарэчы, таксама адоранага талентамі, займела сабе (як тут далікатней сказаць) фаварыта ў Рымунях. А фаварыт той прайграўся ў Вільні ў карты. Справа гонару было заплаціць доўг. Дзеля гэтага пан Расальскі пачаў начамі высякаць старадрэвіны ў лашанскім лесе і прадаваць іх праз мясцовага карчмара Бастомскага. Але грошай на пагашэнне доўгу ўсё роўна не хапала, а пані Дабжынская сказала, што сыну яны патрэбны на паездку ў Парыж… Ёсць звесткі, што ў тую ноч Дабжынскі прыгразіў Расальскаму, што выведзе яго на чыстую ваду.

Ва ўсякім выпадку, злашчасны пісталет паліцыя знайшла ў такім месцы, куды ён аніяк не мог трапіць у выпадку самазабойства. Паліцыя, у рэшце рэшт, пакінула (відаць, за грошы) Расальскага ў спакоі. Але сумленне яго мучыла. Праз нейкі час ён прыйшоў да лашанскага двара і павесіўся сам. Пасля гэтага за сядзібай Дабжынскіх цвёрда замацавалася найменне: “месца нячыстае”.

— Якое ж яно нячыстае? — запярэчылі мастакі-ўдзельнікі міжнароднага пленэра, які закончыўся ў пачатку чэрвеня ў Лошы стараннем Астравецкага райвыканкама і мясцовых краязнаўцаў Ганны Чакур і Алеся Юркойця. — У гэтых маляўнічых мясцінах вельмі добрая энергетыка. Ажно 70 палотнаў паўстала тут за некалькі дзён, пераважна пейзажаў. Пераважае на іх ліловы бэз, які буяна цвіў уздоўж адзінай, але доўгай вуліцы Лошы.

На пленэр сабраліся жыхары і ўраджэнцы Астравецкага раёна. З Вільнюса прыехалі нашы суайчыннікі Хрысціна Балаховіч, Бірутэ Куцкайтэ, Ірэна Герасім і Алег Аблажэй. Мінск прадстаўлялі Кастусь Качан і Алесь Суша. Былі ўдзельнікі з Вілейкі і Навагрудка. Жаданай госцяй пленэра стала доктар паліталагічных навук Алена Глагоўская з Гданьска (Польшча). Гэта яна прывезла ў Лошу сем твораў (а ўсіх было каля трохсот!) Льва Дабжынскага, раней вядомых тут толькі па чорна-белых ксеракопіях. Перадаў іх лашанцам пляменнік мастака Яцак Бітэль-Дабжынскі. А сярод палотнаў – від старога лашанскага двара, пабудаванага з ліставічных бярвенняў яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя. Гэта тут ладзіліся прадстаўленні на беларускай мове, гэта сюды прыязджалі на канікулы маладыя і таленавітыя мастакі з Вільні. Гэта тут раней месцілася “нячыстая сіла”, а цяпер — добрая, творчая энергетыка



Кастусь Качан “У Лошы зацвіў бэз”

На месцы, дзе раней стаяла лашанская сядзіба, быў асвечаны памятны камень у гонар роду Дабжынскіх. У іх ліку — і сенатар Антон, і сястра мастака доктар медыцыны Надзея Бітэль-Дабжынская, аўтар этнаграфічнай аповесці “Як ведзьма Агрыпіха знахарству мяне вучыла” і беларускіх лірычных вершаў. У мясцовым касцёліку айцец Казімір адправіў імшу за супакой душаў Дабжынскіх. А ў мясцовым Доме культуры адкрылася выстава твораў удзельнікаў міжнароднага пленэру. Яны звярнуліся да прысутнага ў зале намесніка старшыні Астравецкага райвыканкама Віктара Свілы з прапановай стварыць у райцэнтры карцінную галерэю або гісторыка-краязнаўчы музей імя Льва Дабжынскага. Яго аснову склалі б творы таленавітага мастака, чыё жыццё так рана і так трагічна абарвалася ў Лошы, а таксама палотны ўдзельнікаў пленэру. Ён абяцае стаць традыцыйным, бо на Астравецкай зямлі (літаратары назвалі яе “Беларускай Швейцарыяй”) багата маляўнічых краявідаў, якія варты ўвекавечання.

# Дапамога стане бліжэй

**Ірына Цімохіна**

**У Гомелі пачалі працаваць першыя інфармацыйныя сацыяльныя пункты. Яны адкрыліся ў самым буйным раёне абласнога цэнтра — Чыгуначным.**

Як паведаміла дырэктар раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Вольга Бачкарова, сёння створаны два такія пункты — у мікрараёне “Гомсельмаш” і пасёлку Касцюкоўка.

Такога роду форма работа з насельніцтвам распачата перш за ўсё для задавальнення патрэб інвалідаў і пажылых людзей, якім часта праблематычна дабрацца да тэрытарыяльнага цэнтра. Сацыяльныя пункты пачнуць дзейнічаць па прынцыпу выязных “прыёмных” — раз у месяц супрацоўнікі службы будуць прыязджаць да грамадзян і праводзіць кансультацыі па пытаннях, што датычыцца пенсійнага заканадаўства, сацыяльных гарантый, платных паслуг. Разам з інспектарамі будуць працаваць і псіхолагі, да якіх наведвальнікі таксама могуць звярнуцца за кансультацыяй.



Вось так гасцінна прымае турыстаў этнаграфічны комплекс, што знаходзіцца недалёка ад Магілёва

# Праехаць па глыбінцы

Еўрапейскі цэнтр агра- і экатурызму разам з грамадскім аб’яднаннем “Адпачынак у вёсцы” ўпершыню праводзяць Міжнародны веласіпедны тур па Беларусі.

**Вольга Карней**

Маршрут будзе пралягаць па заходне-ўсходніх рэгіёнах краіны. Па словах старшыні аб’яднання “Агра- і экатурызм” Валерыі Кліцуновай, прадстаўніцтва Еўрапейскага цэнтра агра- і экатурызма (ECEAT) у Галандыі разам з прадстаўніцтвам ECEAT у Беларусі арганізавалі гэты тур як шлях збліжэння Заходняй Еўропы з Беларуссю. Першая частка тура пачнецца ў горадзе Белавежа (Польшча) 15 жніўня.

Як расказала Валерыя Кліцунова, ад’язджаючы з Белавежы, якая на паўночным захадзе мяжуе з Беларуссю, валанцёры праедуць па прыгожых запаведных мясцінах Беларусі. А ў дні, калі не будзе велапрабегу, удзельнікі сустрэнуцца з мясцовымі жыхарамі глыбінкі. Так замежныя госці змогуць больш даведацца аб самабытнай культуры і традыцыях беларускай вёскі.

Запланаваная колькасць удзельнікаў праекту складзе каля 20 чалавек: валанцёры з Беларусі і іншых краін Еўропы.

Усе жадаючыя прыняць удзел у Міжнародным туры салідарнасці з турыстычнай Беларуссю могуць зарэгістравацца на сайце belarus@eceat.nl і пачынаць збірацца ў дарогу.

# Удала выступілі на свяце ў Прыбалтыцы

**Ганна Бондарава**

**Народны ансамбль “Беларусь” з Бабруйскага раёна прадставіў нашу краіну на юбілейным, 10-м свяце песні і танца “Славянскі вянок”, якое праходзіла ў Эстоніі.**

Свята было прымеркавана да Дзён славянскага пісьменства і культуры і сабрала творчыя калектывы з Беларусі, Латвіі, Літвы, Нарвегіі, Расіі, Украіны, Фінляндыі і Эстоніі.

Сольны канцэрт беларускіх артыстаў у горадзе Кохтла-Ярве прайшоў з вялікім поспехам. Ад імя шматлікіх гледачоў ансамблю цёпла падзякавалі дэпутат парламента Эстоніі Валерый Корб, мэр горада Яўген Салаўёў, кіраўнік беларуска-эстонскага аб’яднання павета Іда-Вірумаа “Бэз” Маргарыта Астравумава. Ансамбль прымаў таксама ўдзел у шэсці па вуліцах Старога горада Таліна і ў свабодным гала-канцэрце свята ў самай вялікай зале эстонскай сталіцы — Горхоле.

Варта адзначыць, што ў музеі сучаснага мастацтва горада Пярну — летняй сталіцы Эстоніі — адкрылася 14-я Міжнародная выстава “Мужчына і жанчына”. Галоўную частку экспазіцыі склалі творы вядомых беларускіх майстроў Руслана Вашкевіча, Андрэя Шчукіна і Уладзіміра Цэслера.

Ва ўрачыстым адкрыцці выставы прыняў удзел генеральны консул Беларусі ў Таліне Аляксандр Астроўскі. Ён уручыў памятны сувенір арганізатару мерапрыемства — дырэктару музея, дэпутату парламента, выдатнаму дзеячу культуры Эстоніі Марку Соасаару і выказаў надзею на развіццё супрацоўніцтва музея з беларускімі аўтарамі.

## Анонс

### Нацыянальныя выставы за мяжой у 2007 годзе

**У чэрвені**
Нацыянальная беларуская экспазіцыя на 18-ым Харбінскім гандлёва-эканамічным кірмашы (г. Харбін, КНР)
Нацыянальная выстава Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча (г. Варшава)

**У ліпені**
Нацыянальная выстава “Беларусь-2007” (г. Цюмень, РФ)

**У жніўні**
Нацыянальная выстава Рэспублікі Беларусь у Турцыі (г. Стамбул, Турцыя)

**Заснавальнік:** Рэдакцыя газеты «СБ»
**Рэдактар** Віктар Харкоў
**Адрас:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290—60—11 **E—mail:** golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
**Аб’ём выдання:** 1 друк. арк. **Тыраж:** 2000 **Заказ:** 655
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2007